# *Майстар беларускай прозы*

**(да 125-годдзя з дня нараджэння Кузьмы Чорнага)**

# БІЯГРАФІЯ ПІСЬМЕННІКА

Кузьма Чорны (Мікалай Карлавіч Раманоўскі) — першапраходзец беларускага рамана, пісьменнік, празаік, драматург, эсэіст, перакладчык.

Член Саюза пісьменнікаў Беларусі з 1934 года.

Кузьма Чорны нарадзіўся 24 чэрвеня 1900 года ў маёнтку Боркі (цяпер Капыльскі раён). Яго бацька, селянін без зямлі, працаваў парабкам. Пасля Цімкавіцкага народнага вучылішча і самастойнай падрыхтоўкі ў 1916 годзе, ён паступіў у Нясвіжскую настаўніцкую семінарыю, якую ў 1919 годзе закрылі польскія ўлады, вымусіўшы Чорнага спыніць вучобу.



(1900-1944)



Пасля вызвалення Случчыны ад белапалякаў, Чорны працаваў сакратаром, справаводам і вясковым настаўнікам. У 1923 годзе ён паступіў на літаратурна-лінгвістычнае аддзяленне педфака БДУ, дзе спалучаў вучобу з працай і творчасцю. Ён актыўна пісаў, працаваў у газеце «Беларуская вёска» і быў членам «Маладняка». У 1926 годзе ўступае ў літаратурнае аб'яднанне «Узвышша», а з 1928 года цалкам прысвяціў сябе пісьменству.

З 1932 па 1937 год Чорны быў галоўным літкансультантам у кабінеце маладога аўтара пры Саюзе пісьменнікаў БССР. У кастрычніку 1938 года яго арыштавалі і праз 8 месяцаў вызвалілі. Заключэнне падарвала здароў'е пісьменніка, жахі засценкаў сказаліся і на псіхалагічным стане. Калі пачаліся баявыя дзеянні, ён уступіў у армію, але быў перанакіраваны ў групу журналістаў, працаваў у газеце «Раздавім фашысцкую гадзіну». У 1944 годзе вярнуўся ў Мінск і працаваў у часопісе «Беларусь». Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі і партызанскім медалём.



# УКЛАД У РАЗВІЦЦЁ ЛІТАРАТУРЫ

**У часы агульнага панавання сацыялістычнага рэалізму філасофская прырода таленту дазволіла пісьменніку выйсці за межы сацыяльнага запыту і стварыць па-сапраўднаму глыбокія мастацкія тэксты з аналітычным псіхалагізмам.**

**Кузьма Чорны ў сваёй творчасці акрэсліў новыя шляхі развіцця беларускай літаратуры: стаў стваральнікам сацыяльна-псіхалагічнай і інтэлектуальна-філасофскай прозы. У яго атрымалася па-новаму адкрыць свету беларуса і беларускае жыццё.**

**Пісьменнік распрацоўваў буйны жанр, які толькі пачынаў сталець і замацоўвацца ў нашай літаратуры, — псіхалагічна-філасофскі раман.**

# ТВОРЧАСЦЬ ПІСЬМЕННІКА

Друкаваўся з 1920 года як паэт пад уласным прозвішчам. У яго вершах шмат празаічнага, апісальнага, маляўнічага, і іх можна чытаць як прозу. У 1923 годзе ў мінскіх газетах з'явіліся яго першыя апавяданні пад псеўданімам Кузьма Чорны, пачынаючы з «На гарніцы». Ён пісаў невялікія нарысы, апавяданні і навелы, і хутка выйшлі зборнікі: «Апавяданні», «Срэбра жыцця», «Хвоі гавораць», «Вераснёвыя ночы», «Нянавісць» і інш. Яго раннія апавяданні ў асноўным апісвалі жыццё беларускай вёскі ў часы грамадзянскай вайны і першыя гады аднаўлення.






Піша шэраг аповесцей і раманаў: «Сястра», «Зямля», «Лявон Бушмар», «Ідзі, ідзі» і інш. У пачатку 1930-х ён задумаў стварыць мастацкую гісторыю беларускага народа ад знішчэння паншчыны да сучаснасці. З'яўляюцца раманы «Бацькаўшчына», «Трыццаць год» (не завершаны), «Трэцяе пакаленне», аповесць «Люба Лук'янская». Рукапісы раманаў «Простыя людзі», «Вялікае выгнанне», «Судны дзень» згарэлі ў пачатку Вялікай Айчыннай вайны.









**Працаваў і ў драматургіі, напісаў п'есы «Бацькаўшчына», «Базылевічава сям'я», «Ірынка». Тэма бацькаўшчыны і барацьбы беларускага народа супраць фашыстаў набыла моцнае гучанне ў яго творах перыяду Вялікай Айчыннай вайны. Акрамя задуманых раманаў, ён пісаў нарысы, фельетоны і апавяданні.**

**Апошні раман Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні» — спроба пісьменніка асэнсаваць лёс Беларусі ад Кастрычніцкай рэвалюцыі да Вялікай Айчыннай вайны.**

**Праз усю творчасць пісьменніка праходзіць ідэя чалавечнасці, сцвярджэнне спагадлівасці, суперажывання чалавека чалавеку.**



# ЛІТАРАТУРА КУЗЬМЫ ЧОРНАГА Ў БІБЛІЯТЭЦЫ ІМЯ Д.Р. НОВІКАВА




**891.72**
**Л 867 п. к.**
**Луфераў, М. П.**
**Проза Кузьмы Чорнага / М. П. Луфераў. – Мінск : Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1961. – 158 с.**

**Ставіцца задача паказаць, як Кузьма Чорны мастацкі вырашае праблему фарміравання новага, савецкага чалавека, праблему палітычнага, культурнага і духоўнага росту беларускіх працоўных мас у працэсе рэвалюцыі.**




**Ч 755 з. т. / 1**
**Чорны, К.**
**Збор твораў : у васьмі тамах / К. Чорны. – Мінск : Мастацкая літ., 1972 - 1975.**
**Том першы : Апавяданні 1923 - 1927 / рэд. В. В. Барысенка ; аўт. камент.: А. Д. Атаева, А. Ф. Харкевіч. 1972. – 554 с.**

**У першы том Збору твораў Кузьмы Чорнага ўвайшлі апавяданні 1923 - 1927 гг.**




**Ч 755 в. т.**
**Чорны, К.**
**Выбраныя творы / К. Чорны ; аўт. прадм. Ул. Карпаў. – Мінск : Дзяржаўнае выдавецтва БССР, 1947. -– 437 с.**




**Ч 755 а.**
**Чорны, К.**
**Апавяданні / К. Чорны ; мастак: А. Сапетка, Ю. Пучынскі. – Мінск : Дзяржаўнае вучэбна-педагагічнае выдавецтва БССР, 1953. – 122 с.**

**Ч 755 б.**
**Чорны, К.**
**Бацькаўшчына. Трэцяе пакаленне : раманы / К. Чорны. – Мінск : Беларусь, 1970. – 440 с.**




**Раманы Кузьмы Чорнага «Бацькаўшчына» і «Трэцяе пакаленне» — каштоўны здабытак беларускай савецкай літаратуры. Яны расказваюць пра падзеі імперыялістычнай і грамадзянскай вайны, пра Вялікі Кастрычнік. Гэта своеасаблівы летапіс жыцця працоўнага чалавека, яго шляху з цемры і галечы ў новае жыцце, у ночы, шчаслівы век.**




**Ч 755 в. н.**
**Чорны, К.**
**Вераснёвыя ночы : апавяданні, аповесці / К. Чорны ; склад., аўт. прадм. М. Рагуля. – Мінск : Мастацкая літ., 1984. – 608 с.**

**Кнігу класіка беларускай прозы Кузьмы Чорнага склалі лепшыя яго апавяданні і шырокавядомыя аповесці «Лявон Бушмар» і «Люба Лык'янская».**

# *Майстар беларускай прозы*

**Віртуальную выставу падрыхтавала**
**бібліятэкар 2-й катэгорыі Лапцева Л. Д.**